Кожны шукае прыпрацовак у залежнасьці ад спецыяльнасьці. Але гэтага хапае хіба на першых часах. На старэйшых курсах пытаньне ставіцца актуальней. Патрэбна сталая праца з пэрспэктывай уладкаваньня пасьля дыплёму. І тут перад галодным студэнтам паўстае дылема – што важней? Вучоба да пераможнага канца або праца з перапынкамі на сэсыі? Абраўшыя першы шлях выйграюць толькі ў тым выпадку, калі маюць сур'ёзныя прэтэнзыі зваліць за мяжу працаваць па спэцыяльнасьці. У другіх – праблемы іншага кшталту. Зарана саскочыўшы з адукацыйнага канвеера, чалавек можа ўсё адно стаць добрым спецыялістам у сваёй галіне. Але часам, калі не хапае адукацыйнага падмурку і ўласных мазгоў, можна выйсьці на замкнёнае кола. Так узьнікаюць журналісты, што не падымаюцца вышэй рэпартажаў з публічных акцыяў, альбо прагрdebsрамеры, здольныя адно да дробных халтур.

У любым выпадку абедзьве катэгорыі даходзяць да дыплёму і вылятаюць з дзьвярэй роднай ВНУ, маючы ў кішэні джынсаў корку маладога спецыяліста. Пачынаюцца рэаліі.

Працуй, негр, сонца яшчэ высока!

Сёньня ў большасьці беларускіх ВНУ ёсьць разьмеркаваньне. Калі вас не разьмеркавалі па блаце ў Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта або яшчэ якую грашовую кантору, дык прыйдзецца трымаць іспыт на самастойнасьць.

Ізноў-такі ёсьць некалькі шляхоў. Першы, пра які ўжо распавядалася, – пры наяўнасьці добрага дыплёму й адпаведнай спецыяльнасьці зваліць за кардон. Некаторых тэхнічных спецыялістаў там прымаюць ахвотна. Некаторым нічога ня сьвеціць. Палітычна актыўныя гуманітарыі могуць атрымаць прытулак у Чэхіі ці Польшчы. У любым выпадку эмігрантаў чакае праца з прымальным па беларускіх мерках заробкам і стан «грамадзянаў другога сорту» – па месцы пражываньня.

Тыя, хто застаюцца, могуць нядрэнна ўладкавацца й тут. Галоўнае – вырашыць праблемы па асноўным месцы працы. Дзякуй Богу, разьмеркаваньне ўсё ж не такое строгае. У прынцыпе, можна ўзяць і вольны дыплём, але навошта? Калі праз нейкі пэрыяд з начальствам пачнуцца разыходжаньні па адвечным пытаньні *«Колькі вы мусіце плаціць за такую працу, і колькі я мушу працаваць за такія грошы?»*, дык трымаць у большасьці выпадкаў ніхто ня будзе. І гэта прыемнае адрозьненьне ад старой савецкай сыстэмы. Жыцьцё сёньняшняга маладога спэцыяліста – працоўная кніжка ў адным месцы, рэальная праца – ў абсалютна іншым. Напрыклад, адзін знаёмы магістрант працуе ў Кіраўніцтве справамі прэзыдэнта. На асноўнай працы ў НДІ яму штотыдня афармляюць камандыроўкі па Менску – ў бібліятэку, у іншыя інстытуты і г.д. Такая сытуацыя абсалютна тыповая для большасьці спецыяльнасьцяў, што не карыстаюцца попытам на рынку працы.

Але ў прынцыпе разьмеркаваньне, супраць якога ўпарта змагаюцца ЗБСаўцы з малодшых курсаў, не такое страшнае, як яго малююць. Гэта рудымент разбуранай савецкай сыстэмы сацзабеспячэньня. Насамрэч, калі б разьмеркаваньня не было, праблемы (пошук працы, недахоп грошай) засталіся б абсалютна тымі самымі. Лёгкія разборкі, што часам здараюцца з кіраўніцтвам на фармальнай працы, – нармалёвая плата за мізэрны, але лёгкі й гарантаваны заробак.

Уладкавацца па спэцыяльнасьці для *«технарей»* практычна немагчыма. Лепей за ўсіх у гэтым пляне праграмістам, якім для працы апрэч уласных мазгоў патрэбныя толькі кампутары і зарплата. І тое, і іншае ёсьць у заходніх кантор, якія з задавальненьнем выдаткоўваюць сюды сродкі. У параўнаньні з заробкам заходняга праграміста нашыя задавальняюцца мізэрам. Але мізэр, які зарабляюць «негры»-праграмісты, выглядае вельмі салідна на агульнабеларускім узроўні.



Фактычна сёньня Менск зьяўляецца сталіцай гэтак званага афшорнага праграмаваньня ў былым Савецкім Саюзе. Да добрай падрыхтоўкі спецыялістаў дадайце дрэнныя эканамічныя ўмовы – і атрымаеце ідэальны аазіс для буржуйскіх інвэстыцыяў. Зразумела, афармляюцца грошы не заўсёды легальна – асабліваасьці інвэстыцыйнага клімату. Але ў любым выпадку праграмны прадукт атрымліваецца, з пункту погляду кантор, якасным і танным. Прычым сілкуюцца афшорам як прыватныя, так і дзяржаўныя канторы.

Незалежна ад адукацыі, можна нядрэнна зарабіць журналістыкай, працай на літаратурных плянтацыях Адама Глёбуса або палітычнымі спекуляцыямі. Прынамсі, шмат народу паднялося падчас апошніх выбараў, працуючы на штабы розных кандыдатаў. На жаль, апошні выгляд заробку – сэзонны, і разьлічваць на яго мае сэнс толькі ў выпадку, калі вы здолееце нахапаць адразу на пяць год наперад.

Калі ёсьць знаёмствы, можна падацца ў сьферу абслугоўваньня. Можна нядрэнна зарабляць у будаўнічых фірмах, працаваць таксыстам, займацца гукарэжысурай або нечым падобным. Улічваючы айчынную спецыфіку, распачаць уласны бізнэс не атрымаецца, таму даводзіцца прыбівацца да якойсьці з кантор адпаведаній накіраванасьці.

Віртуальная апазыцыйнасьць

Такім чынам, больш-менш уладкоўваецца ў жыцьці большасьць моладзі, хаця й робіць гэта насуперак вызначаным для яе схемам.

Фактычна гэта й ёсьць заўтрашні мідл-клас. І чакаць сацыяльных зрушэньняў ад яго – ня варта. Бо актыўная незадаволеная моладзь, якая прагне капіталістычнай рэвалюцыі, – міт, існуючы хіба ў галовах апазыцыі. Найбольш актыўныя ўжо пасьпяхова адаптаваліся да гібрыднага айчыннага «протакапіталізму», існуючага ў спалучэньні буржуйскіх кантор з дзяржаўнай сыстэмай. Ці ты працуеш пад крутой дзяржаўнай структурай, ці пад капіталістычнай канторай, ці нават у апазыцыйнай газэце – ты намёртва злучаны з дзяржавай. Большасьць апазыцыйных журналістаў ненавідзіць Лукашэнку, але ведае, што страціць працу ў выніку перамогі дэмакратыі. Зразумела, як прагрэсыўны чувак ты мацюгаеш грамадзкі лад за пляшкай піва *«Доктор Дизель»* пад цыгарэтку *«Marlboro»* і нават наведваеш апазыцыйныя сайты ў Інтэрнэце. Але гэтым пратэст і вычэрпваецца, бо тваё існаваньне гарантаванае той сыстэмай, якую ты лаеш. Мітынгамі й рэвалюцыйнасьцю мідл-клас перахварэў на малодшых курсах, пакуль не сутыкнуўся з жыцьцём. Потым асабліва рамантычныя пайшлі ў апазыцыйныя структуры. А іх сябры, стаўшы на ногі, заўжды радыя прыняць заказ на вёрстку чарговага передвыбарчага сайта. І дэмакратыі добра, і кішэню грэе.

Таму моладзевай рэвалюцыі ў сучаснай Беларусі не было, няма і быць ня можа. Найбольш актыўная частка моладзі не зацікаўленая ў зьмене ладу. Тыя ж, каго гэтая сытэма выкінула на абочыну, апынаюцца ў меньшасьці. Яны прыгнечаныя нізкім заробкам, татальнай незапатрабаванасьцю й ня могуць вынесьці свой голас за межы піўнякоў. І сапраўдным нонканфармістам у гэтых умовах зьяўляецца не зацяты ўдзельнік мітынгаў, які на пяты год змаганьня абзавёўся мабілай і кватэрай, а 23-гадовы супрацоўнік Акадэміі навук, які па уікэндах выбіраецца на прыроду, зарабляючы на ўтрыманьне жонкі з дзіцём... браканьерствам. Ён ужо нічога не чакае ад сыстэмы і не прывязаны да яе. Праз дзесяць год сёньняшнія змагары ўвойдуць у істэблішмэнт, а ён застанецца маргіналам.


Дзеля таго, каб набрацца снабізму, заўтрашняй эліце трэба яшчэ троху падрасьці. ■

ПО ПОВОДУ

«Бельведер в Северных Афинах»

НИКОЛАЙ КОРНЕЙЧУКОВ

236 лет назад родился князь Михаил Клеофас Огинский — композитор, соратник Тадеуша Костюшко и один из самых известных белорусских эмигрантов.



Звуки полонеза «Прощание с Родиной», знакомые нам с детства, – пожалуй, все, что мы можем вспомнить о князе. Между тем, Огинский – автор оперы «Зелида и Валькур, или Бонапарт в Каире» (1799), многих военных и патриотических песен и маршей. Во время восстания 1794 года он участвовал в боевых действиях на территории современных Беларуси и Литвы. После разгрома повстанцев он попрощался с родиной на 8 лет, а свои переживания увековечил в мелодии полонеза.

Вернувшись на родину в 1802 году, он сыграл решающую роль в политической жизни Северо-Западного края первой четверти XIX века. Советник Александра I, сенатор с 1810 года, он разработал для царя проект возрождения Великого княжества Литовского в составе Российской империи. К сожалению, проект был отвергнут. Удалившись от дел в 1823 году, Михаил Огинский уехал с семьей во Флоренцию, где и умер пятого октября 1833 года.

Празднование дня рождения нашего замечательного соотечественника состоялось 23 сентября в Залесье – поместье Огинского, где он провел самые плодотворные годы своей жизни (с 1802 по 1823).

Ныне Залесье находится в стадии реконструкции, поместье превращено в музей. Хранителями парка и дворца дотошно воссоздается обстановка времен Огинского. Основным, но далеко не единственным источником сведений о поместье является поэма Александра Ходьки «Залесье». Востоковед и славист, друг Адама Мицкевича, Ходька в 1822 году гостил у Огинского и в своей поэме детально описал поместье.

Начало традиции отмечать дни рожденья Михаила Огинского, а значит, собирать в Залесье людей, неравнодушных к историческому прошлому нашей страны, положил в 1990 году Сергей Веремейчик – сотрудник Залесского музея, а по совместительству – руководитель детской театрально-музыкальной студии «Альтанка».

Первое празднование собрало 40 человек и прошло почти что по-семейному. С каждым годом мероприятие становилось все масштабнее. Дни рождения Огинского привлекли к Залесью внимание меценатов, способствовали началу реставрации дворца и благоустройства парка. Кстати, в этом году, как и в прошлом, праздник носил странное на первый взгляд название «Бельведер в Северных Афинах». Как объяснил Сергей Веремейчик, «бельведер» переводится с итальянского как «прекрасный вид», а Северные Афины – это, конечно же, Залесье. Значит, гости, число которых перевалило далеко за сотню, приехали в Залесье не только послушать концерт, но и полюбоваться прекрасной природой.

«Альтанка» основательно подготовилась к празднику и выступила со спектаклем в необычном жанре «игра в оперу» под названием «Вечер в Северных Афинах, или Сон Антоньки». Это удивительное выступление длилось полтора часа. В старинной музыке, обработанной для трио «клавиши-гитара-скрипка», зазвучали джазовые мотивы, а юные исполнители вокальных партий творили чудеса. С трудом верилось в то, что эти таланты выросли в Залесье и в Сморгони. Компанию «Альтанке» на залесской сцене составили гродненский бард Виктор Шалкевич, группа «Старая Литва», детский ансамбль «Гулянок» из школы искусств города Сморгони. Концерт, а вместе с ним и праздник, закончились троекратным «*Vivat*» Михаилу Клеофасу Огинскому и дегустацией фирменной залесской настойки «Бельведеровка». ■


ИНИЦИАТИВА

Коссовский дворец ждет реставрации

НИКОЛАЙ КОРНЕЙЧУКОВ

С 11 по 16 сентября недалеко от самого маленького города Беларуси — Коссово — прошел добровольный молодежный лагерь «Коссовскому дворцу — жить!».

Коссовский дворец – один из трех сохранившихся в мире дворцов, построенных в стиле неоготики, – десятки лет испытывал недостаток в человеческой заботе. За эти десятилетия деревья пробили корнями когда-то крепкую кладку, пол дворца исчез под слоем мусора, а стены покрылись похабными надписями. Случайно попавшие во дворец весной этого года студенты истфака БГУ не стерпели такого надругательства над историческим наследием и взялись за организацию волонтерского лагеря – в помощь разрушающемуся дворцу.



Несмотря на то, что государство не выделило на проведение работ ни копейки, лагерь состоялся. Как говорится, на голой инициативе. Из-за недостатка финансирования пришлось отменить запланированный акустический концерт возле дворца, не хватило средств на удаление граффити с его стен (для этого нужны дорогостоящие растворители). Очень помог в проведении лагеря горисполком города Коссово, обеспечивший волонтеров инструментами и отчасти провиантом, а также предоставивший автобус для возвращения участников лагеря из Коссово. Отдельное спасибо Белорусскому Зеленому Кресту, без туристического снаряжения которого не удалось бы разбить палаточный городок.

Всего в работе лагеря приняло участие больше сорока студентов вузов Минска. За пять дней студенты очистили дворец от деревьев, кустарников и травы, убрали мусор, поставили у его стен лавочки и обозначили кострища, чтобы туристы отдыхали не на территории дворца, а в специально отведенных для этого местах, сделали настилы над особо ценными участками кладки дворца. Установка на проходящем мимо шоссе указателя «Дворец Пусловских, 1838 г.» стала местным праздником. А еще студенты дали в коссовском дворце культуры концерт современной белорусской музыки и провели для коссовских школьников познавательную викторину на исторические темы. Нечего и говорить, что призы волонтеры купили за собственные деньги.

Работа, проведенная студентами во дворце, мизерна по сравнению с той, которую еще предстоит сделать, чтобы дворец стал гордостью Беларуси. Реставрация пока что остается несбыточной мечтой, но законсервировать дворец, предотвратить его дальнейшее разрушение реально. Нужно только, чтобы власть имущие и те, у кого есть деньги, осознали ценность уникального дворца для страны, чтобы у них появилось желание помочь дворцу и тем самым вписать свои имена в историю Беларуси. Так, как это сделали участники лагеря «Коссовскому дворцу – жить!». ■

КОЛА ГІСТОРЫІ

СТАЛЁВЫ ПАНЦЫР ІМПЭРЫІ

ЛЕЎ КОТАВІЧ

Нядаўнія апэратыўна-тактычныя вучэньні «Нёман-2001» чарговы раз прадэманстравалі мускулатуру сучаснай беларускай вайсковасьці адносна як дробных балтысцкіх суседак, гэтак і сусьветнае супольнасьці ўвогуле.

Здаецца, як у старыя савецкія часіны, урад вырашыў некага зьдзівіць альбо папросту папалохаць сваімі ўражальнымі паказчыкамі ў вайсковай справе. Зьява гэткага кшталту не выпадковая й ужываецца далёка не ўпершыню. За савецкім часам для Беларусі буйныя вучэньні былі ня дзівам. Бадай што ніколі мілітарысцкія гульні Крамля не міналі бокам беларускі куток. Дзеля таго, каб пераканацца ў гэтым, дастаткова ўзгадаць найноўшую гісторыю краіны.

Далёка ня самая буйная па тэрыторыі хаўрусная рэспубліка дзякуючы свайму надзвычай каштоўнаму геаграфічнаму становішчу адносна Расеі адразу ж пасьля сканчэньня Другой сусьветнай вайны была ператворана ў сапраўдны сталёвы панцыр савецкай імпэрыі. Створаная ў лютым 1946 году Чырвонасьцяжная Беларуская вайсковая акруга (БВА) на працягу ўсяго існаваньня Савецкага Саюза па сутнасьці ўяўляла адну з найбольш надзейных сярод шаснаццаці ўволуле. Гэта тлумачылася тым, што ў выпадку вайны акурат праз Беларусь палягаў карацейшы шлях варожых сілаў да сэрца Расеі, і наадварот, менавіта з тэрыторыі нашай рэспублікі было магчыма найбольш удала і раптоўна, чымсьці з астатніх куткоў СССР, зьдзейсьніць нечаканы ўдар па НАТАўскіх групоўках, якія былі расkватараваны на абшары [illegible]

нашпігаваньнем тэрыторыі Беларускай ССР разнастайных кшталтаў зброі, не шкадуючы ані намаганьняў, ані сродкаў. Тым болей, у разьлік нязвыкла было браць настроі насельніцтва альбо ягоны дабрабыт ды здароўе.

Усьведамляючы тое, што «халодная вайна» у любы момант можа ператварыцца ў «гарачую», савецкі ўрад разьмяшчаў на тэрыторыі Беларусі найбольш дасканалую і патрэбную зброю, перадусім – ядзерную, ды іншыя ракетныя часьці адмысловага прызначэньня. Ажно страшэнна ўявіць, што дзейлася ў нас і якімі закладнікамі жудаснай ды бязьлітаснай вайны былі мільёны нашых суайчыньнікаў, калі часткова пералічыць велічэзную колькасьць зброі масавага зьнішчэньня, якая месьцілася з ласкі кіроўных колаў на тэрыторыі нашай радзімы. Дзеля прыкладу ўзгадаем колькі кропак, якія ў сярэдзіне ды напрыканцы 80-х гадоў былі агучаны ў замежных СМІ: па дзевяць ракетаў сярэдняй далёкасьці знаходзілася на кожнае з наступных схованяў у Віцебскай вобласьці – Паставы, Ветрына, Полацак; Гарадзенскай – Смаргонь, Ліда, Гезгалы, Слонім; Берасьцейскай – Ружаны, Засімовічы; Гомельскай – Мазыр, Жыткавічы і Петрыкаў – па шэсьць, Рэчыца – 9. Акрамя таго, у вышэйзгаданы лік не ўваходзяць 18 трэнінгавых ракетаў СС-20.

Увогуле, згодна з дадатковым мэмарандумам, які савецкі бок агучыў на ўвесь сьвет 8 сьнежня 1987 году ў Вашынгтоне падчас падпісаньня Р. Рэйганам ды М. Гарбачовым дамовы аб поўным эмілінаваньні ракетаў сярэдняй й кароткай далёкасьці, з 470 ракетаў сярэдняй далёкасьці тыпу РСД-10 (г.зв.СС-20) 151 разьмяшчалася ў розны час на тэрыторыі Беларусі. Па краіне былі таксама раскіданы базы ракетаў кароткае далёкасьці. Ёсьць меркаваньні, што на Беларусі існаваў нават палігон выпрабаваньняў ядзернай зброі, што й ня дзіўна.

Каля заходніх межаў краіны савецтаў разьмяшчаліся і буйныя тэхнічныя вузлы. Так, дасюль дзейнічаюць вузел супрацьпаветранага абвяшчэньня ў Ганцавічах, а таксама цэнтар радыёсувязі падводных чоўнаў СССР ў Вялейцы.

З 1986 году сярод беларускіх багнаў ды гушчароў распачалося будаўніцтва таемнага аб'екту «Сьвіслач», які меўся стацца стаўкай галоўнага камандуючага войскаў заходняга напрамку, г. зн. Штабам кіраваньня аб'яднанымі сіламі Арганізацыі Варшаўскае дамовы. Праўда, пазьней гэты аб'ект гэтак і не завершылі.

Найбольш «спрытныя» ў вайсковым сэнсе баёвыя злучэньні Савецкай Арміі кватараваліся на Беларусі. Тут і замаскаваная брыгада спэцназу ГРУ, і буйныя паветрана-штурмовыя адзінкі, і ажно дзьве баяздольныя панцырныя арміі. Мянушка «танкавая рэспубліка» на той час як аніколі лепей пасавала Беларусі. Па меркаваньнях Міністэрства абароны, на момант развалу Савецкага Саюза ў рэспубліцы апынулася звыш чатырох тысячаў танкаў, болей за тры з паловай тысячы БМП, безьліч БТРаў.

Нягледзячы на тое, што Беларусь, здаецца, ня мае аніякага непасрэднага дачыненьня да мора, тут кватараваліся фармаваньні ВМФ СССР – марское лятунства-бамбавозы (Быхаў), асяродкі шкаленьня (Пінск). Усё гэта, бясспрэчна, велічэзнай дакутай уклалася на плечы незалежнай Беларусі.

Натуральна, што дзеля падтрыманьня баяздольнасьці неабходна было шторазова штудаваць гэткае «багацьце». Беларускую зямлю адно й арала ды баранавала вайсковая тэхніка падчас вучэньняў: «Дняпро-67», «Нёман-68», «Дзьвіна-70», «Бярэзіна-78», «Захад-81» і г.д.

Зараз ужо ня ёсьць таямніцай, што савецкая прамысловасьць цалкам працавала на абаронку, а звыш дзесяці адсоткаў тэрыторыі адносна маленькай рэспублікі займалі вайсковыя аб'екты – залогі, вытворчыя прадпыемствы, гаспадарчыя склады. Між іншым, беларускае войска дасюль выкарыстоўвае парэшткі вайсковага адзеньня, якое было назапашана яшчэ з тых часінаў. Пэўна, не было аніводнае іншай краіны сьвету, дзе б існавалі наступныя жахлівыя ды вар'яцкія суадносіны сярод насельніцтва: на 43 цывільныя асобы даводзілася па аднаму вайскоўцу. Дзеля прыкладу варта зазначыць, што лічбы ў суседніх рэспубліках былі наступныя: Расея – на 634, Ўкраіна – на 98, Казахстан – на 118.

Варта нагадаць, што гэткія падлікі былі зробленыя ведамым беларускім гісторыкам на эміграцыі Янкам Запруднікам. На пачатку 90-х гадоў С. Шушкевіч падкрэсьліў, што верагодней за ўсё на Беларусі кватаравалася на момант развалу СССР блізу 240 тысячаў вайсковых службоўцаў: 180 000 – асноўная колькасьць, 60 000 – абслугі. Вядома, на дабрабыт жыхароў краю гэта акалічнасьць не зрабіць цяжкі адбітак не магла. Дарэчы, нават пасьля набыцьця сапраўднай дзяржаўнай незалежнасьці Беларусьсю ўлетку 1991 году колькасьць вайсковых залогаў памяншалася надта марудна, а зноўку створаныя аб'яднаныя ўзброеныя сілы СНД пад расейскай вайсковай камандай ў асобе маршала Я. Шапашнікава, па сутнасьці, былі падначаленыя Расеі.

Апрача таго, што шпарка выкарыстоўваліся тэрыторыя ды нетры Беларусі ў вайскова-палітычных мэтах, дык ня менш былі задзейнічаны ў гэтай справе ўраджэнцы краіны. Праз г.зв.»гарачыя кропкі» у 14-ці краінах сьвету, дзе Савецкі Саюз высьвятляў свае адносіны з ідэалягічным ворагам, а таксама дапамагаў краінам трэцяга сьвету будаваць «сацыялістычны рай», прайшлі дзесяткі тысячаў беларусаў. Паўночная Карэя, Віетнам, Ангола, Эфіопія - гэта досыць няпоўны сьпіс месцаў, дзе давялося па волі лёсу й кампартыі змагацца землякам. Ганебнае таўро акупантаў будзе яшчэ доўга цкаваць шэраг суайчыньнікаў, якія бралі ўдзел ва ўтаймаваньні народных хваляваньняў у Вугоршчыне (1956) альбо Чэхаславаччыне (1978). Сярод 14,5 тысячаў беззваротных стратаў абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане дахаты не вярнуліся (альбо, дакладней кажучы, вярнуліся ў цынкавых трунах), паводле афіцыйных зьвестак, 723 беларусы.

Шляхам людзкіх ахвяраў, чалавечых жыццяў ды калецтваў разьлічваўся наш народ за нікчэмныя гульні тамтэйшых кіраўнікоў. Цяпер нават цяжка адразу ўзгадаць краіну, дзе б не была заўважна ў розны час збройная прысутнасьць савецкага каляніяльнага панцыру. Сярод «савецкага інтэрнацыяналу» беларусы засьведчылі сябе належным чынам. На сярэдзіну 70-х гадоў ў шыхтох Савецкай арміі і ВМФ налічвалася толькі адных генералаў і адміралаў ВМФ – 75, СА – 299, маршалаў – 2. Тым часам, пераважная большасьць іх мусіла адбываць вайсковую чыннасьць далёка па-за межамі Бацькаўшчыны. На момант набыцьця незележнасьці Беларусьсю недзе каля 20 адсоткаў суайчыньнікаў-афіцэраў служылі ў межах сваёй рэспублікі.

Гэткім чынам, пазбавіўшыся нацыянальнага аблічча, Беларусь за кароткі прамежак часу была ператвораная ў сталёвы панцыр савецкай краіны, якому было наканавана пільнаваць заходні й найбольш небясьпечны ды стратэгічны напрамак. Ня дзіўна, што за гэны час БССР уважалася адной з найбольш атэістычных хаўрусных рэспублікаў, дзе нацыянальна-культурніцкае жыццё адыходзіла ў нябыт. На гэткія рэчы савецкім кіроўным колам папросту бракавала часу й імпэту. Роля «вартавой брамы» ды нашпігаванага да бязконцасьці зброяй пудзіла для іншых мае зусім абгрунтаваную й даўнюю гісторыю. Толькі вось сёньняшнія вонкавыя цяглiцы трошкі ня тыя, вось і застаецца, што запужваць выключна сябе саміх. ■

ОТЧЕТЫ

Будьте здоровы!

ЕВГЕНИЯ ТАМАРИНА

«В ряду самых актуальных жизненных ценностей, по данным социологических исследований, «здоровье» стоит лишь на месте восьмомдевятом, – с сожалением отмечают сотрудники санитарно-эпидемиологической службы Беларуси. – *Видно есть более насущные проблемы».*

Впервые за 35 лет в Беларуси зафиксировано уменьшение острых кишечных инфекций. Благодаря внедрению массовой иммунизации населения удалось снизить заболеваемость корью, коклюшем, краснухой. На завершающем этапе работа по ликвидации полиомиелита. А инфекционные и паразитарные заболевания сократились по 35-ти формам. И в Беларуси сейчас отмечают самый низкий уровень смертности от инфекционных заболеваний среди стран СНГ. «*Еще в шестидесятые годы мы забыли о дифтерии,* – говорит главный государственный санитарный врач Минска Федор Германович. – *Наблюдали только единичные случаи. Но сегодня эта проблема снова стала актуальной. Мы не смогли убедить население в том, что единственный надежный способ защиты – вакцинация, и в прошлом году потеряли двух человек».*

В рамках системы мониторинга окружающей среды в Беларуси создана система санитарно-гигиенического мониторинга. Эта программа включает изучение составляющих здоровья населения, факторов, влияющих на него, и разработку мероприятий. «*Сейчас мы производим оценку рисков,* – говорит заместитель министра здравоохранения, главный государственный санитарный врач Республики Беларусь Валерий Филонов. – *То есть, просчитываем возможность возникновения различных заболеваний, если не предотвращать опасность».*

Для обеспечения безопасности продуктов питания проводится анализ рисков и контроль критических точек. «*Когда в начале 90-х годов мы ввели новые нормативы по радионуклиину продуктов питания,* – рассказывает Валерий Филонов, – *то количество радиации в каждом из нас в течение полугода уменьшилось в полтора-два раза».* Сегодня больше всего радионуклидов накапливают ягоды, причем не только лесные, но и выращенные на приусадебных участках (все, кроме клубники). Также активно впитывает радиацию и зелень.

В настоящее время санитарно-эпидемиологическая служба пытается ликвидировать заболевания, связанные с дефицитом поступления в организм йода, селена и других микронутриентов. Совместно с Минсельхозпродом разрабатывается программа по созданию технологического производства новых функциональных пищевых продуктов. Но когда эти новшества внедрят в производство, неизвестно. А пока многие сотрудники зарубежных посольств предпочитают покупать продукты питания в Литве.

С апреля прошлого года введены в действие новые санитарные правила, определяющие более высокие требования и к качеству воды. Также продолжают изучать санитарно-гигиенические условия по районам Минска. «*Скоро мы сможем сказать, насколько велик риск возникновения того или иного заболевания в каждом районе Минска,* – отметил Федор Германович. – *За этим стоит архитектурное планирование города. Ведь сегодня для Минска шум и транспортные потоки являются одними из важных проблем».* Говорят, что этому способствует и массовый ввоз импортных машин с многолетним пробегом. «*Конечно, то, что мы в последнее десятилетие приняли на себя их автомобильную свалку, не лучшим образом отражается на атмосфере,* – продолжает Федор Германович, – *но транспорт, который выпускается у нас, не лучше, если не хуже западных марок. А некоторые страны уже ввели определенные квоты на ввоз, среди них и Россия».*

Сегодня в Беларуси численность работающих в условиях, не отвечающих санитарно-гигиеническим нормам, превышает 25 процентов. Высоким остается удельный вес тех, кто трудится под воздействием повышенного уровня шума, большой запыленности воздуха. По данным социологических исследований, при абсолютно положительном отношении людей к здоровому образу жизни на практике используют рекомендации по сохранению здоровья лишь 15 процентов населения. ■

АКЦЫЯ

Ударым роварам па «мэрсах»!

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Падобна, што беларускія сэксменшасьці ў асобе лігі «Лямбда» пачынаюць ствараць файны тандэм з анархістамі, разам актыўна ўпрыгожваючы спектар грамадзкіх акцыяў аранжавым колерам.

Пасьля гучнага й трыюмфальнага Параду Каханьня, праведзенага напярэдадні выбараў, Беларуская Ліга Лямбда й ФАБ не спынілі творчага супрацоўніцтва. Новай прыгожай сумеснай акцыяй стала падтрымка экалягічнага перфомансу менскага клюбу аматараў ровараў пад кідкім лёзунгам «Дарогі без аўтамабіляў!»

Правядзеньне 22 верасьня «Дня без аўтамабіляў» – міжнародная ініцыятыва эўрапейскіх радыкальных эколягаў, заклікаyая да звароту ўвагі грамадзкасьці на актуальныя экалягічныя праблемы. Удзел у ёй сёлета прымала каля тысячы гарадоў 33 краінаў ад Канады да Камбоджы. Як сьцьвярджаюць натхняльнікі руху, разьвіццё індустрыйнага грамадзтва, павелічэньне колькасьці прыватных аўтамабіляў ставіць пад пагрозу свабоду перасоўваньня пешаходаў і экалягічную бясьпеку плянэты. Радзіма сьвята – Францыя, але за тры гады яе існаваньня акцыя дасягнула агульнаэўрапейскіх маштабаў. У Эўропе мерапрыемства падтрымліваецца муніцыпалітэтамі гарадоў і ўладамі краін. У нас умовы абсалютна іншыя – гэта нізавая ініцыятыва, якая ў бліжэйшы час відавочна не будзе падтрыманая ўладамі.

У лепшых традыцыях Лямбдаўска-ФАБаўскіх акцыяў, ніякага ўзгадненьня з уладамі не праводзілася. Проста пасярэдзіне суботняга дня ўваход у парк культуры й адпачынку імя Горкага быў акупаваны вясёлым натоўпам на веліках. Жвавыя хлопцы весяліліся, расьсякаючы прастору на двукольных сябрах, і раздавалі адпачываючым мінакам газэту «Навінкі» разам з улёткамі антыаўтамабільнага зьместу. Атмасфэру карнавалу дапаўняў антыкарпаратыўны слоган «*Bike! Just do it!*», маляўніча замацаваны на сьпіне аднаго з арганізатараў. Але сапраўдны фурор і весялуха распачаліся, калі да ўдзельнікаў аранжавай акцыі далучыліся сябры «Лямбды», якія падвезлі на асобным веламабілі самую маляўнічую персону – травесты *Vava*. Атмасфэра агульнага вясельля й сьвята паступова распаўсюдзілася на ўсю прылеглую частку парку.

На месцы былі зладжаныя курсы па навучаньні ўсіх жадаючых майстэрству язды на роварах. Поўнасьцю давершыла карціну, зьяўленьне на арэне яшчэ аднаго віду экалягічнага транспарту – поні, на якіх у парку каталі маленькіх дзяцей.

Удзел у сьвяткаваньні двух буйных альтэрнатыўных арганізацыяў прыдаў яму патрэбны размах. Што прыцягнула да мерапрыемства анархістаў і гей-лесбі рух?

Адзін з прысутных на акцыі прадстаўнікоў ФАБ так камэнтуе сітуацыю:

«*Я лічу, што сёньняшняя акцыя зьяўляецца абсалютна неабходнай, бо рэсурсы плянэты на зыходзе. Хутка не застанецца ні нафты, ні газу, ні вугалю. І тым ці іншым чынам чалавецтва ўжо сёньня вымушанае разьвіваць тыя ці іншыя формы альтэрнатыўных крыніцаў энергіі й спосабаў перасоўваньня. Хаця, шчыра кажучы, асабіста я дрэнна адношуся да ровараў.*

Праблема ў тым, што на хвалі спажывецкага ажыятажу ўсё больш насельніцтва кідаецца набываць аўтамабілі, абсалютна не думаючы аб тым, што заняпад грамадзкага транспарту вельмі адмоўна ўплывае як на экалёгію, так і на свабоду перасоўваньня па вуліцах буйных гарадоў. У Парыжы, напрыклад, загадам мэра-сацыяліста ўжо нават уведзены падзел на аўтамабільныя і роварныя дарожкі. Менавіта з мэтай збіць хвалю аўтамабільнай маніі й перасадзіць народ на ровары. Сёньняшняя акцыя аматараў ровараў – таксама спроба нанесьці ўдар па адпаведных спажывецкіх стэрэатыпах беларускага абывацеля.»

Што тычыць Лігі «Лямбда», то ейны ўдзел тлумачыцца абсалютна проста – беларускія геі й лесьбіянкі любяць усіх і падтрымліваць усе прагрэсыўныя ініцыятывы, ненакіраваныя на распальваньне варожасьці й нянавісьці паміж людзьмі.

Напрыканцы акцыі да ўдзельнікаў-такі падыйшоў чалваек у цывільным, які, насуплена гледзячы на Ваву, пацікавіўся, ці дазволенае мерапрыемства й ці ўзгодненае яно з кіраўніцтвам парку. Паколькі ніхто не забараняе грамадзянам катацца на веліках у парку адпачынку, арганізатары сумленна адказалі, што ўсё абсалютна легальна. Мужык адваліў узгадняць інфармацыю й больш не зьявіўся... Яшчэ праз хвілін сорак актыўных велагуляньняў шоу нарэшце было скончанае.

Можна лічыць, што экалягічная акцыя цалкам удалася. Нават сумна будзе, калі клюб аматараў ровараў зарэгіструецца афіцыйна й пачне занудную канцылярскую барадзьбу з гарвыканкамам. За дарожкі для ровараў, за прыпынкі й тэхсервіс... Лепей ужо змагацца за экалёгію па-альтэрнатыўнаму – зь вясёлкавымі сьцягамі й карнавалам. Вынік той самы, затое весялей! ■

РЭЦЭНЗІЯ

«Реальный РЭП. Часть три»

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Беларускі хіп-хоп знаходзіцца зараз прыкладна ў тым жа стане, што й рок-н-рол годзе гэтак у 1995. Гэта значыць, што ўжо ёсьць сфармаваная субкультура, рэгулярныя канцэрты й нават рэлізы. Засталося толькі дачакацца выбуху, пасьля якога музычная плыня легітымізуецца ў вачох шырокага айчыннага слухача. Прадстаўленая зборка – адна з тых, аб якіх можна гаварыць як аб папярэдніках гэтага выбуху і ператварэньня субкультуры ў шоу-бізнес.

Усяго на дыску 15 трэкаў, прэзэнтуючых самыя папулярныя зараз хіп-хоп праекты Беларусі, і тры «гасцьявых» бонуса ад самых раскручаных хардкоршчыкаў – «*КУКЛЫ*», «Папён*кінг* Бэнд» і *ZET*. Агульнае ўражаньне ад кампіляцыі дастаткова showнае.



Пасьля хітовай «*В мои глаза смотри*» кампазыцыі Повара і прыгожа-мэлядычнай «*Город*» («*СЕМЬЯ B.U.G.A.*») распачынаецца блёк відавочна масава-камэрцыйных кампазыцыяў, разьлічаных на тое, каб іх купіў слухач, якому захацелася «*рэпа настоящего, вкусного, бодрящего*». Аўтаматычна ўзгадваюцца рок-зборкі Супрановіча з дакладнай працэнтовай узважанасьцю «танцавальных» і «прагрузных» хітоў. Нават моўны прынцып злоўлены з дакладнасьцю да наадварот. Калі Супрановіч з прынцыпу паліткарэктнасьці ўтыкае ў беларускую зборку троху руска-(англа-) моўных песень, дык на «*REAL RAP*» можна знайсьці пару беларускамоўных кампазыцыяў ад *Zet* і Аляксандра Памідорава. Але трэба аддаць належнае складальнікам – слухаюцца яны ў агульным кантэксьце нармальна й арганічна ўпісваюцца ў канцэпцыю.

Але усё ж такі рэп мусіць быць ня толькі прыгожым, але й сацыяльным. Шчыра кажучы, была боязь, што на дыску не апынецца нічога, апрэч стараннага эпігонства ДеЦЛа і інш. Памыліўся!

Шэраг ударных тэмаў годныя таго, каб упрыгожыць калекцыю нават далёкага ад гэтай стылістыкі чалавека. Безумоўны хіт нумар 1 – файна зробленая кампазыцыя «*Пророчество*» (R.I.P.-legion). Дасьціпная музыка, пранізьлівы й эпічны тэкст, глябальная праблематыка. Кампазыцыя – абсалютна пасьпяховы й завершаны мастацкі твор.

Варта адзначыць вельмі патрэбную тэму ад гамяльчан *THA CODLA* – зварот да падлеткавага суіцыду, размова аб праблеме мовай тых самых падлеткаў, а не публіцыстычных заклікаў. Старым панкам вельмі спадабаецца наезд на патрыярхаў беларускай сцэны ў кампазыцыі «*Кто стоит за этим*» ад «*ГОРОДСКОЙ ТОСКИ*». Канешне тэму троху псуе перанасычанасьць таннымі пантамі. Але тым ня менш ёсьць і сур'ёзная развага над тым, каму выгадна абалваньваць электарат культурнай жуйкай для мазгоў. ■

БЕЗ ВЫБОРА

Пролет над Аргентиной

Ни для кого не секрет, что для всех теннисистов мира Кубок Дэвиса представляет собой аналог чемпионатов мира в других видах спорта. Разумеется, всем хочется как можно удачнее выступить в этом турнире. К сожалению, наша мужская сборная пока не может похвастаться особыми успехами. Наиболее значимыми шансы исправить существующее положение вещей признавались в этом году, ведь белорусские теннисисты Владимир Волчков и Максим Мирный ныне демонстрируют хорошую и уверенную игру.

Очередную попытку пробиться в мировую группу наша команда предприняла в Аргентине. Для этого требовалось малое: обыграть хозяев. Несмотря на то, что предматчевые расклады были не в нашу пользу, надежда все-таки жила. Однако надолго ее не хватило. Оказалось, стиль игры, который проповедуют наши ребята, не совсем подходит для выступлений на грунтовых кортах. Это стало очевидным практически сразу, как и то, что наша команда проиграет. Другое дело, как она проиграет? Но даже оказать достойное сопротивление наша дружина не сумела, вчистую проиграв все встречи аргентинцам.


Впервые сильнейшие

Во Франции завершился чемпионат Европы по баскетболу среди женщин. Вопреки расхожему мнению о нелогичности и непредсказуемости женских командных соревнований, европейское первенство закончилось именно так, как и должно быть. Победил самый достойный. В данном случае им оказалась сборная Франции, которая провела турнир просто феноменально, ни разу не дав никому даже повода усомниться в своем превосходстве над соперницами. Как итог – победы во всех восьми сыгранных француженками поединках.

В очередной раз не сумела подняться на высшую ступень пьедестала российская команда. Чаще какой-либо другой европейской сборной добираясь до финала, россиянки с 1991 года (тогда еще сборная СССР) никак не могут выиграть. На этот раз они вполне заслуженно уступили француженкам 68:73.

Еще на стадии финала выбыл из борьбы победитель предыдущего чемпионата Европы сборная Польши. Полячки, пусть в напряженной борьбе, но все же проиграли литовкам – 81:83. Более того, наши западные соседки не сумели завоевать и последнюю, пятую путевку на чемпионат мира, уступив в решающем поединке сборной Югославии. Такой неутешительный результат вполне закономерен для недавнего триумфатора, так как во Франции уже не было польской команды. Была Малгожата Дыдек, старавшаяся играть в баскетбол, и набор людей, категорически не понимавших, зачем ей это нужно. А поскольку один человек не в состоянии весь турнир тащить на себе команду, то полячки не сумели даже приблизиться к своему недавнему триумфу.

По завершении чемпионата, как и недавно на мужском первенстве в Турции, была проведена жеребьевка полуфинального раунда будущего чемпионата, в котором уже в ноябре предстоит стартовать и сборной Беларуси. Жребий определил в соперницы нашей дружине команды Югославии, Словакии и Латвии. Главный тренер сборной Виктор Белевич считает, что рассуждать о шансах не имеет смысла, нужно просто хорошо подготовиться и хорошо выступить, и тогда придет результат.



Игра нервов

Чем ближе конец чемпионата Беларуси по футболу, тем ожесточенней борьба. И не только на футбольном поле. Тяжелее всех приходится группе команд, ведущих борьбу за медали и, конечно же, судьям. Кого-то обвиняют в том, что они всех купили, кого-то в том, что они продались. В общем-то так бывает часто, но обычно все подозревают всех. На этот же раз все дружно ополчились против лидирующей в чемпионате «Белшины».

В чем заключается вина бобруйского клуба, понять несложно: всех купили. А вот на вопрос: «Откуда знаете?» ответов как-то маловато. Чаще всего приходится слышать, что многие команды даже на двоих не пробили столько пенальти, сколько одна «Белшина». Действительно, много. Так что же делать игрокам и тренерам бобруйчан? Может, заранее просить судью не назначать эти самые пенальти? И штрафные с угловыми заодно, ведь с них тоже много забивают. А может, проблема не в «Белшине», а в общей некомпетентности нашего судебного корпуса? Ведь практически в каждой игре нашего чемпионата не обходится без судейских ляпов, но таких скандалов, как после поединка «Белшина» – «Славия», не бывает. Может быть, все оттого, что каждый хочет выиграть, а каким способом, это дело третье?

Если проблема только в том, что «Белшина» идет на первом месте, то это не ее вина, а вина ее соперников. Кажется, из всех команд, декларировавших весной свои чемпионские устремления, соответствует им только «БАТЭ». Независимо от того, удачно складывается для них игра или не очень, дал судья пенальти или нет, сильнее соперник или слабее, борисовцы просто играют в свой футбол и все аргументы в свою пользу приводят на поле. И в том, что та же «Славия» сейчас на пятом месте, а не на первом, виновата только она сама. И неизвестно, как бы относились к той же «Славии», будь она на первом месте, если ей и так частенько вспоминают чемпионство «МПКЦ» 96-го года.

Ответа на вопрос, покупала кого-то «Белшина» или не покупала, мы все равно не получим. Станет ли благодаря этому бобруйская команда чемпионом или нет, зависит не от них, а от того, как будут против них играть соперники. Даже, пожалуй, один соперник – борисовский «БАТЭ». Если борисовцы не допустят нелепых осечек в оставшихся встречах, то вопрос о чемпионе решится в их очном противостоянии с «Белшиной», так что все зависит только от них.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 1 ОКТЯБРЯ



15.00, 18.00, 23.25 Новости.
15.20 Детективный сериал «Жюли леско».
17.00 «Морская полиция». Сериал.
17.50 Фильмы братьев Люмьер.
18.20 Зона Икс.
18.35 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Батэ». Передача из Борисова. 2-й тайм.
19.25 Мелодрама «Завтрак с видом на эльбрус».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 «Человек моря». Сериал.
22.30 Стадион.
22.55 Планета «Арт».



8.15 «Земля любви». Сериал.
9.15 «Каменская: Стечение обстоятельств».
10.20 Док. детектив. «Вьетнамское подполье в москве».
10.50 Библиомания.
11.15 Комедия «Кавказская пленница, или новые приключения шурика».
12.50 «Болливуд - фабрика грез». Спецрепортаж.
13.10 Добрый день.
14.15 Возможно все.
14.35 Звездный час.
15.00 «Цыган».
16.00 Большая стирка.
17.00 Вечерние новости.
17.25 «С легким паром!»
18.00 «Земля любви». Сериал.
19.00 Жди меня.
20.00 Время.
20.30 «Пятый угол».
21.40 Независимое расследование.
22.30 Ночное «Время».
23.00 «На футболе» с Виктором Гусевым.
23.40 Боевик «16-й отдел».

5.15 «Верность любви». Сериал.
5.45 Православный календарь.
6.15 «Телепузики».
6.40 Семейные новости.
7.15 Экспертиза РТР.
7.30 Национальный доход.
7.40 Мультфильмы.
8.15 Худ. фильм «Семейные тайны».
10.30 «Фитиль».
10.45 Детектив «Кобра». Фильм 1-й.
12.30 «Что хочет женщина». Ток-шоу.
13.30 «Шальные деньги». Сериал.
14.25 «Дикий ангел». Сериал.
15.20 Премьера. «FM и ребята».
16.30 Теннис. Международный турнир «Кубок кремля-2001».
18.00 Сериале «Воровка».
19.35 Местное время. Вести - Москва.
19.55 Премьера. «Пуаро Агаты Кристи. Убийство роджера Акройда».
22.30 Местное время. Вести - Москва.
22.45 Худ. фильм «Неопровержимые улики».
0.45 Спорт за неделю.



7.05, 11.30, 17.30, 23.00 Новости культуры.
7.30 «У твоего порога». Худ. фильм.
8.45 «Музыкальный салют».
9.40 Документальный экран.
10.35 Сферы.
11.15 «Марица». Мультфильм.
11.45 «Демидовы». Худ. фильм.
13.00 Мультфильмы.
13.30 Вместе с Фафалей.
13.45 Все суры Корана.
14.05 Живое дерево ремесел.
14.15 Архитектурная галерея.
14.30 Теннис. Международный турнир «Кубок кремля-2001».
15.00 Новости.
15.10 Теннис. Международный турнир «Кубок кремля-2001».
16.00 Документальный экран.
17.00 Сверхнаука. «Опасность в небесах».
17.50 «Век русского музея».
18.15 «Маргерит волан». Сериал.
19.00 Концертино.
19.15 Портреты в камне. «Повержен будет вавилон». Фильм 1-й.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 «Играем шиллера». Спектакль театра «Современник».
21.35 «Что делать?»
22.30 От киноавангарда к видеоарту.

8.00 «Тихие страсти магдалены». Сериал.
8.55 Ток-шоу «Слушается дело».
9.40 Телемагазин.
10.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
10.15 Петровка, 38.
10.25 Телеканал «Дата».
11.15 УРОКИ РУССКОГО. А.Куприн.
11.35 «Момент истины».
12.30 Деловая Москва.
13.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
13.15 «Инспектор Кресс». Сериал.
14.30 «Все народы россии». Чукчи.
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 МУЛЬТПАРАД.
16.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
16.15 Дом на набережной.
16.45 «Московское счастье» Валентины Талызиной.
17.15 «Антимония». Интерактивная игра.
18.00 «Узурпаторша». Сериал.
18.50 Пять минут деловой Москвы.
19.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
19.40 Особая папка.
20.05 Прогноз погоды.
20.10 «Доживем до понедельника». Худ. фильм.
22.15 Времечко.
22.45 Петровка, 38.
23.00 25-Й ЧАС. СОБЫТИЯ.
23.20 Ночной полет.
23.55 Дневник «Евразийского телефорума».
0.05 НАВЕКИ ЗОЛОТЫЕ. «T-Rex».

6.30 «Кот по имени ик». Мультсериал.
7.00 «Таинственные рыцари Тир На Ног». Сериал.
7.30 «Мурашки». Мультсериал.
8.00 Новости.
8.15 Телеспецназ.
8.30 Мир спорта глазами «Жиллетт».
9.00 Боевик «Розовый кадиллак».
11.30 Случайный свидетель.
12.00 Новости.
12.45 REN TV - 10 лет.
14.00 «Секретные материалы». Сериал.
15.00 «Таинственные рыцари Тир На Ног». Сериал.
15.30 «Мурашки». Сериал.
16.00 «Кот по имени ик». Мультсериал.
16.30 «Икс-мен». Мультсериал.
16.55 «Чертенок». Теленовелла.
19.00 «Симпсоны». Мультсерия.
19.30 Триллер «Поцелуй смерти».
21.45 «Подозрение». Сериал.
23.00 «Обозрение».
23.45 Футбольный курьер.

5.35, 14.30 «Арабела». Телесериал.
6.05 «Счастливого пути!»
6.20 «Голова на плечах». Молодежная программа.
6.35 Мультсериал «Симба-футболист».
7.05, 23.00 «Человек и море». Сериал.
7.30, 1.15 «Четыре танкиста и собака». Сериал.
8.30, 11.30, 14.30, 20.30, 2.30 «Факты дня».
8.40 Худ. фильм «Даки».
10.15 «Счастливого пути!»
10.35 Научно-популярный сериа «Путеводитель для гурманов».
11.00 Мультсериал «Симба-футбо лист».
11.45 Просто песня.
